Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СНЕЖАНЬ 4 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 267 (4811) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — XVII партз'езд сустрэць баявой падрыхтоўкай да веснавой пасеўнай кампаніі.

Вынікі і бліжэйшыя задачы правядзення нацыянальнай палітыкі на Украіне — з даклада тав. КАСІОРА С. В. на лістападаўскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК КП(б)У.

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТА ЦК КП(б)Б аб конкурсе сельсветаў.

Пісьменнікі РСФСР у гасцях у пагранічнікаў.

ЗА МЯЖОЙ.

Тав. М. ЛІТВІНАЎ прыбыў у Рым.

СССР і Чэхаславакія.

Дэкларацыя французскага прэм'ера ў палаце дэпутатаў.

XVII ПАРТЗ'ЕЗД СУСТРЭЦЬ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

СССР прыходзіць да XVII партыйнага з'езда як квітнеючая краіна будаўніцтва сацыялізма, стварыўшая магутны фундамант сацыялістычнай эканомікі.

З адсталай аграрнай краіны з нізкай тэхнікай, з мільёнамі непісьменных, краіна Саветаў ператварылася ў перадавую індустрыяльную дзяржаву з перадавой тэхнікай, з гігантскай прамысловасцю і самым буйным перадавым эксплярабствам у свеце.

Пад сацыялістычную сельскую гаспадарку падведзена магутная тэхнічная база. Каля 3.000 машына-трактарных станцый, сотні тысяч трактараў і складаных с.-г. машын — вось якой сілай узброены калгасы саюзгасы і калгасы. Гэта сіла расце і будзе расці з кожным днём.

Калгасны лад перамог канчаткова і беспаваротна. Няма ў свеце такой сілы, якая-б магла павярнуць сялянства на іншы шлях. Шматмільённыя масы вёскі ўпэўніліся на сваім вопыце ў перавагах калгаснага лада. Словы тав. СТАЛІНА аб ператварэнні калгаснікаў «у людзей, карыстаючыхся багаццем прадуктаў і вядучых зусім культурнае жыццё», ажыццяўляюцца.

Ужо ў гэтым годзе тысячы калгасаў БССР атрымліваюць на працадзень па 3-4 і 5 кілограмаў збожжа.

Партыя пад геніяльным кіраўніцтвам тав. СТАЛІНА не толькі павярнула працоўнае сялянства на калгасны шлях, не толькі забяспечыла калгасную вёску перадавой тэхнікай, але ў асобе палітаддзелаў дала калгаснаму ладу і лепшых арганізатараў-большэвікоў.

Зараз больш чым калі-б там ні было ад нас саміх запежыць дабіцца поўнага калгаснага багацця для ўсіх калгаснікаў. Трэба толькі захацець і мы ўжо ў будучым годзе здолеем дабіцца яшчэ больш высокага ўраджаю, яшчэ больш поўнаважнага працадня і заможнага, культурнага жыцця для ўсіх без выключэння калгаснікаў.

Усё гэта патрабуе зараз ад кожнай партыйнай арганізацыі, ад усёй масы калгаснікаў суотрэць надыходзячы XVII з'езд канкрэтнымі большэвіцкімі справамі на ўсіх участках падрыхтоўкі да вясны будучага года.

Сотні перадавых калгасаў, МТС, МТМ БССР пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый і палітаддзелаў ужо разгарнулі вытворчы паход імя XVII партз'езда.

Заслугоўвае ўвагі практыка палітаддзелаў МТС Мінскага і Слуцкага раёнаў. Тут перадавыя калгасы і брыгады ўжо разгарнулі падрыхтоўку да XVII партз'езда. У радзе калгасаў большэвіцкай МТС ужо закончана ссыпка і ачыстка насення. Перадавыя і лепшыя брыгады абавязаліся да з'езда партыі закончыць падрыхтоўку да вясны, адрамантаваць інвентар, вывезці гной, падрыхтаваць цягавую сілу, арганізаваць гурткі па вывучэнню машын, апра і зоатэхнікі.

Калгасы БССР выканалі першую запаведзь — збожжа і бульбапастаўкі і разлічыліся за работу з МТС. Гэта дае ім зараз магчымасць выкананць і другую запаведзь — ссыпку насення.

Аднак паводле вестак з 65 раёнаў на 1 снежня насенныя фонды па бульбе ссыпаны толькі на 60 проц., а па збожжы і таго менш — на 52 проц.

Ёсць раёны, як Магілеўскі, Жлобінскі, Асіпавіцкі, Гарадоцкі, Асвейскі і Сіроцінскі, дзе ссыпана ўсяго ад 7 да 20 проц. насення збожжавых.

Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што ў большасці раёнаў БССР да ссыпкі насення адносяцца безадказна. Гэтай справай зусім не піруюць.

Насенне — рашаючае звяно ў падрыхтоўцы да вясны. Таму да калгасных складаў з насеннем зараз працягваюць свае рукі класавыя ворагі—кулакі і падкулачнікі, якія імкнуцца сарваць падрыхтоўку да вясны. Аб гэтым сведчыць рад фактаў з практыкі апошніх дзён. Але ў некаторых раёнах мясцовыя работнікі, замест арганізуючай работы вакоп насенных фондаў і мабілізацыі ўвагі калгасных мас, падпадаюць пад уплыў найбольш адсталай часткі калгаснікаў і падкулачнікаў.

У Сіроцінскім раёне, напрыклад, рад старшынь калгасаў прытрымліваецца той думкі, што «раз збожжа змалочана, значыць і ссыпана». У радзе калгасаў Магілеўскага і Сіроцінскага раёнаў насенныя і страхавыя фонды не ссыпаюць на той падставе, што калі «ёсць збожжа ў сэраках, дык і добра, навошта яшчэ ссыпаць». У большасці калгасаў гэтых раёнаў да апошніх дзён насення не ссыпалі, не чысцілі і не здавалі.

Ці трэба даводзіць усю шкодлівасць такіх размоў, якія на руку толькі кулаку?

Гэтыя факты сведчаць аб тым, што большасць раённых арганізацый не здолела ўзначаліць творчы ўздым калгасных мас, не разгарнула канкрэтную падрыхтоўку да XVII партз'езда на гэтым адказнейшым участку.

Калгасы Случчыны ў гонар партыйнага з'езда абавязаліся скончыць ссыпку насення да 10 снежня. Падхапіць гэтую ініцыятыву, зрабіць яе здабыткам кожнага калгаса, кожнага калгасніка — баявая задача партыйных арганізацый, палітаддзелаў.

Конь у спалучэнні з трактарам рашаюць поспех веснавой пасеўнай кампаніі. Не гледзячы на гэта, конская і трактарная цягавая сіла — гэтыя дзве важнейшыя галіны гаспадаркі — засталіся па-за ўвагай многіх партыйных арганізацый. Не выкарэнена яшчэ абязлічка ў скарыстанні і доглядзе коня.

Коня скрозь і ўсюды абдзяляюць пры размеркаванні кармоў, не гледзячы на поўную магчымасць у гэтым годзе забяспечыць коняй канцэнтраванымі кармамі.

Па рамонту трактараў БССР ідзе на самым апошнім месцы па Саюзу. Кастрычніцкі і лістападаўскі план рамонта трактараў сарваны. Гэта тлумачыцца тым, што спразу рамонта трактараў усклалі толькі на МТМ. Партыйныя арганізацыі і наркаматы далей гучных дэкларацый аб рамонце не пайшлі. Канкрэтныя дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб рамонце трактараў не выконваюцца.

Такія безадказныя адносіны да конскай і трактарнай цягавай сілы далей неперапімы. Гэта ставіць пад удар сакрэтаравае правядзенне веснавой сяўбы і барацьбу за высокі ўраджай будучага года.

Большэвіцкая падрыхтоўка да XVII партз'езда патрабуе карэннага пералома на гэтых адказнейшых участках барацьбы за высокі ўраджай будучага года.

«Вялікі гонар для кожнага рабочага, работніцы, спецыяліста, калгасніка і калгасніцы стаць актыўным удзельнікам з'езда партыі і сказаць сабе:

— Я зраблю ўсё неабходнае, каб мая фабрыка, мой завод... мой калгас прышлі да партыйнага з'езда з новымі дасягненнямі».

На гэты заклік маскоўскіх рабочых рабочыя і трактарысты МТМ і МТС БССР павярнулі адказць неадкладнай ліквідацыяй прарыва на ўчастку рамонта трактараў, а калгаснікі і калгасніцы — узмацненнем увагі да насення, завяршэннем баявой падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі.

Партыйная ячэйка калгаса «Парыжская Комуна», Аршанскага раёна, выступіла з каштоўнейшай ініцыятывай аб арганізацыі перадз'ездаўскай перакліч нізавых калгасных партзвенняў. У сваім пісьме ў «Звяздзе» комуністы і комсамольцы калгаса «Парыжская Комуна» паказваюць, як на аснове выканання дырэктыў партыі аб перабудове партыйнай работы пад кіраўніцтвам і з дапамогай палітаддзела яны дабіліся бліскучых поспехаў у справе ператварэння калгаса ў большэвіцкі, а калгаснікаў — у заможных.

Канкрэтнымі справамі па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, па ўздыму ўраджайнасці яны абавязаліся сустрэць XVII партыйны з'езд.

Задача кожнай партыйнай ячэйкі, кожнай партгрупы, кожнага комуніста — уключыцца ў гэтую перакліч, ператварыць яе ў магутны вытворчы паход мільёнаў калгаснікаў імя XVII партз'езда.

РЫХТУЮЦЬ ВЫТВОРЧЫЯ ПАДАРУНКІ

Паведамленне аб скліканні XVII з'езда УсеКП(б) выклікала новы ўздым актыўнасці ў рабочых заводаў імя **Мясніцкова**. На цэхавых сходах рабочыя ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па разгортванню падрыхтоўчай работы да з'езда. Ствараецца фонд рацыяналізатарскіх прапаноў імя XVII з'езда. На заводзе абвешчан конкурс на заваяванне гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі назвы **імя XVII партз'езда**.

Пасажырскі і таварны цэхі абавязаліся адпрацантаваць звыш плана 4 пасажырскія вагоны і 2 ледніцы. У пасажырскім і механічным цэхах арганізуецца 9 новых гаспадарча-разрахунковых брыгад. Рамонтны цэх сваімі сіламі звыш плана ў гаданарунак з'езду ўстанаўляе капрэмонт з аб'ёмам работы на 4 тыс. рублёў у месяц.

Кровелышчыкі **Левін і Валковіч** рамонтнага цэха ўзялі на сябе абавязацельства ў парадку соцыялістычнай дапамогі пасажырскаму цэху звыш плана пакрыць два вагоны. Завод у цэлым абавязаўся выканаць снежаньскі план да 25 снежня.

В.

ХОД СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

Загатоўлена ільнавалакна на 1 снежня

БССР	Зах. вобласць
27 проц.	31 проц.

ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА УДЗЕЛ ВА УСЕБЕЛАРУСКІМ ЗЛЁЦЕ ПЕРАДАВЫХ ІЛЬНАВОДЧЫХ КАЛГАСАЎ

Ліквідаваць адставанне БССР у спаборніцтве з Заходняй вобласцю

РАЁНЫ АДКАЗВАЮЦЬ ЗА ЗАГАТОЎКІ ІЛЬНУ ТАКСАМА ЯК І ЗА ЗБОЖЖАПАСТАЎКІ

Высокаякаснае валакно ў падарунак XVII партз'езду

Работа Ветрынскай МТС выразнае поспех барацьбы Полаччыны за лён. Яе ўдзельная вага — каля 50 проц. усяго раённага плана.

Зусім вядуча Ветрынская МТС лічылася адной з самых адсталых у ільназагатоўках.

У гэтым годзе становішча зусім змянілася. Калгасы МТС вышлі на першае месца па ўборцы, апрацоўцы і загатоўках ільну.

Лён заваяваў ганаровае месца ў рабоце МТС. Ён стаў сапраўды вядучай культурай у калгасах Ветрынскай машына-трактарнай станцыі.

Сваячасова, без страт праведзена цярабленне. Увесь лён быў убраны ў жоўтай спеласці, своячасова разасланы, вамочан і падняты са сцелішч. Амаль ні ў адным калгасе лён не быў патнёен.

Правільная арганізацыя працы, мабілізацыя калгаснікаў на барацьбу за працоўную дысцыпліну, за высокую прадукцыйнасць працы забяспечыла рад поспехаў у здачы ільну дзяржаве.

Яшчэ 15-га кастрычніка быў перавыкананы план загатовак ільнасемя ў 1.693 цэнтн.

Калгасы Ветрынскага сельсавета першымі ў раёне да кастрычніцкіх свят поўнасцю здалі ільнавалакно і па 25 лістапада выканалі 107,3 проц. плана.

Па ўсёй МТС план здачы ільнавалакна выкананы на 60,7 проц.

Рашаючую ролю ў гэтай скрасе адыграў палітаддзел МТС, узняўшы масы на барацьбу за высокі ўраджай і ўзорную якасць ільну.

У адзнаку надыходзячага XVII з'езда партыі зараз на ўсіх калгасах Ветрынскай МТС разгарнулася кругласутачная апрацоўка ільну.

Палітаддзел арганізаваў соцыялістычную дапамогу перадавых адстаючым. Калгасы Ветрынскага сельсавета паслалі брыгады ў дапамогу калгасам Нацкага сельсавета.

На ініцыятыве палітаддзела перадавыя калгасы «Мялешка», «КІМ», «Акцябр» пасылаюць буксірныя брыгады па соцыялістычнай дапамозе адпаасобным гаспадаркам адсталых сельсветаў Гарадоцкага, Бабініцкага і інш. Вызначаны 7 брыгад з 60 лепшых ударнікаў, на чале якіх пастаўлены члены партыі, апраўдаўшыя сябе на практычнай рабоце ў калгасах.

«Злёт перадавых ільнаводчых калгасаў павінен быць скліканы у Полацку», — пад гэтым лозунгам змагаюцца калгасы Ветрынскай МТС за датэрміновае выкананне плана ільназагатовак.

Н. Эрдман.

РЭЗУЛЬТАТ САМАЦЁКА

У групе неільнаводчых раёнаў **Уваравічы** па пераапрацоўцы і здачы ільнапрадукцыі займаюць амаль адно з апошніх месц. На 25 лістапада план здачы ільнавалакна выкананы толькі на 14,4 проц.

Фактычна ў большасці сельсветаў пераапрацоўка ільну нават не пачыналася. 10 сельсветаў як **Чабатовіцкі, Целяшкоўскі, Борхаўскі, Калінінскі** і іншыя не апрацавалі і не здалі дзяржаве ні аднаго фунта ільнавалакна. План здачы ільнасемя ў гэтых сельсветах выкананы толькі на 10-12 проц.

У буйнейшых калгасах — **«Чырвоны шлях», імя Будзённага, «Новае жыццё», «Першае мая»**, больш паловы ільну яшчэ ляжыць на сцелішчах, гніе.

Вакол ільназагатовак ва Уваравічах не вядзецца ніякай масавай і арганізацыйнай работы. Работнікі канторы Загатільна ўвесь час сядзяць на пуніце, у калгасах-жа зусім не бываюць. Між тым, у большасці калгасаў лён пры пераапрацоўцы зусім не сартуецца. На пункт дастаўляецца валакно ніякай якасці, кудлатае, з кастрыцай.

Апарат Загатільна засмечан класава-варожымі элементамі. Прыёмшчык **Пуцінаў** і старшы сартоўшчык **Рохлін** (абодва былыя буйныя гандляры) груба адносяцца да ільназдатчыкаў. Рохліну было дадзена заданне выехаць у сельсветы для інструктажа брыгадзіраў па пытаннях сартавання і пераапрацоўкі ільну. Рохлін выехаць адмовіўся.

Раённыя арганізацыі — райком і райвыканком — пра пераапрацоўку і загатоўку ільну ўспамінаюць вельмі рэдка, між іншым. Лепш за ўсё аб гэтым сведчыць наступны характарны факт. Не так даўно райком КП(б)Б вынес пастанову аб скліканні раённай нарады трапальшчыц. Але, прыняўшы пастанову, райком не ўжыў ніякіх мер для таго, каб правесці яе ў жыццё. Ніякай падрыхтоўчай работы да канферэнцыі ў раёне не правялі. У многіх калгасах нават не ведалі аб скліканні канферэнцыі. Канферэнцыя была сарвана. Зрыў канферэнцыі і ганебнае адставанне раёна—розультат агар тугістычнага самацёка ў рабоце раённых кіруючых і загатоўчых арганізацый.

К—ў.

Сотні ільназдатчыкаў чакаюць прыёмкі

ЧАВУСЫ.

Чавускі раён ганебна правальвае ільназагатоўкі. На 25 лістапада план загатовак ільнавалакна выкананы на 8,6 проц., а ільнатрасты—на 23,7 проц., ільнасемя —на 73,5 проц.

Асабліва адстае аднаасобны сектар, які выканаў план па валакну на 5,7 проц.

Удзельная вага аднаасобнікаў у ільназагатоўках даволі вялікая. Аднаасобнікі павінны здаць не менш 50 проц. усяго прылічваючагася з раёна валакна. Не гледзячы на гэта, сярод аднаасобнікаў не вядзецца амаль ніякай арганізуючай, масавай работы.

Ход ільнавазагатовак тармозіцца зусім нездавальняючай работай прыёмачных пунктаў. На ст. Чавусы на пуніце не хапае прыёмшчыкаў. Ля пункта стварэцца чарга. Штодзённа па 100 фурманак чакае прыёмкі. Ільназдатчыкам прыходзіцца начаваць пад адкрытым небам. Аб культурным абслугоўванні здатчыкаў ільнапрадукцыі ў Чавусах зусім не думаюць.

Загадчык пункта **Рахількін** і загадчык канторы Загатлён **Заскін** не падрыхтавалі пункт да прыёмкі ільнапрадукцыі. На пункце не хапае вагаў.

Райком партыі і райвыканком, ведаючы аб усіх гэтых фактах, не прымаюць ніякіх мер для ліквідацыі затора на чавускім пункце.

Сквернюкоў.

У МАЗЫРШЧЫНЕ АДПАЧЫВАЮЦЬ

МАЗЫР. (Ад наш. спецкора).

Мазырыччына адносіцца да неільнаводчых раёнаў. Усё-ж лён тут вяўсёды сеюць у значнай колькасці. Сёлета Мазырыччына павінна здаць 2.020 цэнт. ільнавалакна і 418 цэнт. пянькі. На 25 лістапада план здачы валакна выкананы усяго на 4,6 проц., пянькі—2,8 проц.

Фактычна загатоўкамі тэхнічных культур у раёне ніхто не кіруе. Пасля выканання плана збожжа- і бульбазагатовак у Мазырыччыне рашылі адпачыць. Усе ўпаўнаважаныя райкома адкліканы з сельсветаў.

Райком і райвыканком, каб застрахаваць сябе, прымацавалі да кожнай установы па сельсавету. Гэты метад сябе зусім не апраўдвае. Рад раённых устаноў, замест запраўднай дапамогі сельсветам і партыйным чэйкам, абмяжоўваюцца пасылкай па месцы тэхнічных работнікаў, якія нездольны правесці масавую арганізуючую работу ў калгасах і вёсках. Работнікі райкома ўсе сядзяць у горадзе.

Гэта прывяло да таго, што ў большасці калгасаў апрацоўка ільну і пянькі не арганізавана. Ільнамялкі не скарыстоўваюцца. Чатыры трактарныя мялкі стаяць на складзе.

Сярод аднаасобнікаў ніякай работы не вядзецца. Аднаасобнікі выканалі план здачы ільнапрадукцыі ўсяго на 1 проц.

Загадчык арганізаўсла райкома тав. **Каган** лічыць становішча з ільназагатоўкамі нармальным, хоць калгасы толькі зараз пачынаюць падымаць лён са сцелішчаў.

У Мазыршчыне яшчэ не зломлен кулацкі сабатаж ільназагатовак.

Мачальскі.

Тав. М. ЛІТВІНАЎ ПРЫБЫЎ У РЫМ

РЫМ, 2.

ПАСЛЯ ПРАБЫВАННЯ Ў НЕАПАЛІ тав. ЛІТВІНАЎ У СПЕЦЫЯЛЬНЫМ САЛОН-ВАГОНЕ ВЫЕХАЎ 2 СНЕЖНЯ Ў РЫМ.

У НЕАПАЛІ ТАВ. ЛІТВІНАЎ АГЛЯДАЎ ГОРАД, РУІНЫ ПАМПЕІ І САРЭНТО. ПЕРАД АД'ЕЗДАМ ЁН ЗАЯВІЎ КАРЭСПАНДЭНТУ АГЕНЦТВА «СТЭФАНІ», ШТО ЁН РАД ПРАДСТАЯЧАЙ СУСТРЭЧЫ З ГЛАВОЙ ІТАЛЬЯНСКАГА ЎРАДА І КІРАЎНІКАМІ МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ, І ПАДЗЯКАВАЎ ЗА ВЕТЛІВЫ ПРЫЁМ.

У РЫМЕ НА ВАКЗАЛЕ ТАВ. ЛІТВІНАВА СУСТРЭЛІ ТАВАРЫШ МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ СУВІЧ, НАЧАЛЬНІК ГАБІНЕТА МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ АЛОІЗІ. АДКАЗНЫЯ РАБОТНІКІ ПАЎПРЭДСТВА СССР І ІНШ. З ГЭТЫМ-ЖА ЦЯГНІКОМ ПРЫБЫЛІ ПАЎПРЭД СССР тав. ПАЦЕМКІН І ІТАЛЬЯНСКІ ПАСОЛ У МАСКВЕ АТОЛІКО. З ВАКЗАЛА т. ЛІТВІНАЎ АДПРАВІЎСЯ Ў ПАЎПРЭДСТВА.

Водгукі ва Францыі і Англіі на паездку тав. Літвінава ў Італію

ПАРЫЖ, 2 снежня (БЕЛТА). Французскія палітычныя колы праяўляюць выключную зацікаўленасць да паездкі т. Літвінава ў Рым. «Тан» прысвяціла гэтай тэме перадавы артыкул і адначасова апублікавала на першай старонцы вялікую карэспандэнцыю з Рыма.

— Тое, што ініцыятыва спаткання належыць Мусаліні,—пішна газета,—паказвае, што Італія хоча ўцягнуць СССР у перагаворы аб разбраенні СССР.

— Устанаўленне афіцыяльных дыпламатычных адносін з ПАЗШ завяршыла ператварэнне СССР у важны фактар міжнароднай палітыкі—заяўляе «Тан».

— Нельга не адзначыць,—гаворыць урэшце «Тан»,— што прыезд Літвінава ў Рым супадае з кампаніяй італьянскага друку па поваду экспансіі Японіі на Блізкім Усходзе.

***

ЛОНДОН. 2 снежня (БЕЛТА).

Ангельскія газеты праяўляюць вялікую зацікаўленасць да маючай быць сустрэчы паміж Літвінавым і Мусаліні. Штотыднёвік «Спектатар» пішна, што гутарка паміж Літвінавым і Мусаліні прыцягвае ўвагу ўсяго света, паколькі мяркуецца, што ў ёй будуць за краніуты праблемы разбраення і рэарганізацыя Лігі нацый.

СССР І ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 2 снежня. (БЕЛТА).

Чэхаславацкае агенцтва паведамляе:

— Паводле вестак «Прагер тагеблат» паведамленні аб непасрэдна надыходзячым прызначэнні дэ-юрэ совецкай Расіі Чэхаславакіяй пазнаёмляюцца з аўтарытэтнага боку з той агаворкай, што, магчыма, патрабуецца яшчэ некаторы час к пачатку перагавораў.

Чакаецца, што гэтыя перагаворы павядуць да станоўчага рэзультата. Прызнанне СССР Чэхаславакіяй мела-б сваім вынікам падобны акт таксама з боку іншых краін Малой Антанты. Газета паведамляе далей, што спатканне Тытулеску з Бенешам, якое было адкладзена ў сувязі з хваробай Тытулеску, адбудзецца на бліжэйшым тыдні ў Кошыцы.

Прыезд латвійскай дэлегацыі

МАСКВА, 2 снежня (БЕЛТА) 2-га снежня прыехала ў Маскву латвійская дэлегацыя па вядзенню перагавораў аб заключэнні гандлёвага дагавора. Склад дэлегацыі: віцэ-міністр замежных спраў п. Мунтэрс, дырэктар дзяржаўнага банка Латвіі п. Озаліньш і дырэктар дэпартамента міністэрства замежных спраў п. Фройманіс.

ДЭКЛАРАЦЫЯ ФРАНЦУЗСКАГА ПРЭМ'ЕРА У ПАЛАЦЕ ДЭПУТАТАЎ

ПАРЫЖ, 2 снежня (БЕЛТА). Другога снежня ў палаце дэпутатаў выступіў старшыня совета міністраў Шотан і агаласіў урадавую дэкларацыю. Шотан звярнуў увагу палаты на неабходнасць тэрміновага вырашэння праблемы збалансавання дзяржбюджэта.

Адзначаўшы пераважаемы краінай фінансавы крызіс, запрудненні казначэйства і крэдытны характар бюджэтнага дэфіцыта, Шотан заявіў, што становішча патрабуе прыняцця тэрміновых і энергічных рашэнняў.

Шотан затым пасмяіваў супроць усмакцыўшыхся за апошні час выпадаў правых колаў супроць парламенцкага рэжыма.

— Лепшы сродак для абароны парламенцкага рэжыма, — заявіў ён,—гэта даказаць, што парламент здолен выканаць свой доўг перад краінай.

Шотан напрабаваў у палаты дэпутатаў выражэння довер'я ўраду для аднаўлення фінансаў і абароны парламентарызма і прыняцця працэдуры «надзвычайнай спешнасці» для абмеркавання фінансавага законапраекта, які павінен паводле яго слоў, «справядлівым чынам размеркаваць неабходныя ахвяры ў інтарэсах краіны».

Пераходзячы да пытанняў знешняй палітыкі, Шотан заявіў, што новы ўрад будзе працягваць традыцыйную мірную палітыку рэспубліканскай Францыі.

— Францыя,— сказаў ён,— застанецца вернай Лізе нацый і ідэі міжнароднага супрацоўніцтва, з таксама заключаным прыяцельскім згодам, саюзам і пактам. Францыя гатова ў перадачу дыпла матычных перагавораў дабіваецца паляпшэння адносін з усімі краінамі.

— Аднак, урад думае,—заявіў Шотан,—што прыватныя згоды могуць служыць справе міра толькі ў тым выпадку, калі яны не аслабяць у якой небудзь меры бяспечнасць Францыі і калі яны не будуць сушырочыць пасляваенным міжнародным абавязацельствам.

— Але ўсе гэтыя такія тэрміновыя і вялікія пытанні,— закончыў ён,—пацвяцалены праблеме адтарэўлення дзяржаўных фінансаў, што з'яўляецца адным з элементаў бяспечнасці Францыі.

Паводле слоў Гавас, частка дэкларацыі, якая закранала перагаворы з Германіяй, была ухвалена радыкал-соцыялістамі, «левай радыкальнай групай», рэспубліканскімі соцыялістамі і неасоцыялістамі. У цэлым дэкларацыя была спаткана стрымана правымі групамі, центрам і соцыялістамі.

Тая-ж дэкларацыя была абвешчана ў сенаце міністрам юстыцыі Рэйнальдзі.

ГАЛОДНЫ ПАХОД ФРАНЦУЗСКІХ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ПАРЫЖ, 2 снежня (БЕЛТА). Другога снежня атрады беспрацоўных з Парыжскай вобласці і дэлегацыі беспрацоўных дэпартаментаў Поўначы і Сены прыбылі ў Сен-Дэні (прадмесце Парыжа). У радзе прадмесцяў Парыжа адбыліся дэманстрацыі беспрацоўных. Дэлегацыя прыбылых беспрацоўных адправілася ў палату дэпутатаў для перадачы патрабаванняў беспрацоўных. Буржуазны друк прысвячае шмат артыкулаў галоднаму паходу. Афіцыяльная зводка паказвае павялічэнне ліку беспрацоўных за апошні тыдзень на 3 тыс. чалавек.

У 18-й акрузе Парыжа адбыўся 2-х тысячны мітынг, на якім выступалі Марсель Кашэн, Дорыо і некалькі рагавых рабочых соцыялістаў. Пасля мітынга некалькі рабочых-соцыялістаў уступілі ў ком партыю.

АМЕРЫКАНСКІ МОРСКІ МІНІСТР ПАТРАБУЕ ПАВЯЛІЧЭННЯ ФЛОТА ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ

ВАШЫНГТОН, 2 снежня (БЕЛТА) Морскі міністр Свенсон у гадавой справаздачы свайго ведамства настойвае на павялічэнні флота ПАЗШ да максімальных лімітаў, дазволеных Лондонскім дагаворам, і на ўзмацненні морскай авіяцыі. У справаздачы ўказваецца, што антыяпонскія выступленні ў Кітаі ствараюць небяспеку для жыцця і інтарэсаў амерыканцаў і што ў сувязі з гэтым неабходна прыкутнасць амерыканскіх ваенных суднаў на р. Янцзы і ў іншых кітайскіх водах.

БЮДЖЭТ ВАЙНЫ

ТОКІО, 2 снежня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення агенцтва «Сімбун рэнго», прэм'ер Саіто дабіўся згоды па пытаннях бюджэта на 1934-35 г. Паводле слоў агенцтва ў марскіх колах задаволены згодаю, маючы на ўвазе, што побач з павялічэннем марскіх расходаў атрымана запэўненне, што на працягу бюджэтнага 1934-35 г. яны змогуць атрымаць асігнаванне на пабудову яшчэ аднаго карабля, не прадугледжанага праектам бюджэта. Апрача таго за морскім ведамствам такіцута права патрабаваць дадатковых асігнаванняў.

ПАТРАБАВАННІ АДСТАЎКІ САІТО

ТОКІО, 2 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва «Сімбун рэнго», праўленне фашыстскай арганізацыі Мейрынкай (звязана з буйнейшымі канцэрнамі Японіі) эноў прыняло рэзалюцыю, якая прапануе ўраду Саіто падаць у адстаўку, бо «Саіто не мае пэўнай палітыкі, не ўсвядомлівае настойлівай неабходнасці дзяржаўнай абароны і не здолен справіцца з надзвычайным становішчам, у якім знаходзіцца краіна».

КАНЦЭНТРАЦЫЯ ЯПОНСКІХ ВОЙСК У ПРАХОДАХ ВЯЛІКАЙ КІТАЙСКАЙ СЦЯНЫ

БЕЙПІН, 2 снежня (БЕЛТА). Газета «Хуабейвапьбао» указвае, што наперакор абяцанням японскіх ваенных улад аб эвакуацыі праходаў Вялікай Кітайскай сцяны, колькасць японскіх войск у Маланьюй (на Паўночны ўсход ад Бейпіна) павялічваецца і зараз перавышае 2 тыс. Звыш тысячы кітайскіх рабочых працуюць на пабудове японскага аэрадрома. З Цзіньчкоў у гэты раён прыбыла плошчадка ваенных аэрапланаў.

Згодна паведамлення той-жа газеты, японскія ваенныя ўлады перагварылі Долонор (правінцыя Чахар) у мангольскі «Аўтаномны раён» і ўключылі ў яго прылягаючыя мангольскія раёны.

— Такім чынам,—піша газета, — патрабаванні японскіх ваенных улад аб размяшчэнні японскіх войск у Лочоне, узмацненне япона-манчжурскіх сіл у Долоноры і Маланьюй, а таксама пабудова аэрадрома ў Сахацзяна (на ўсход ад Маланьюй) указваюць, што японскія ваенныя ўлады паракейшаму ажыццяўляюць планы па арганізацыі серыі ваенных баз у Паўночным Кітаі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ВЫНІКІ І БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ ПРАВЯДЗЕННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ НА УКРАІНЕ

З даклада тав. КАСІОРА С. В. на лістападаўскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК КП(б)У

II. ПРОЛЕТАРСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ СУПРОЦЬ НАЦЫЯНАЛІЗМА

Без Кастрычніцкай рэволюцыі немагчыма было вызваленне украінскага народа ад нацыянальнага ўціску

Ці магчыма было нацыянальнае вызваленне мільёнаў працоўных украінскага народа без Кастрычніцкай рэволюцыі, без сумеснай барацьбы рабочых і сялян Украіны з рускімі рабочымі? Без Кастрычніцкай рэволюцыі, без сумеснай барацьбы з рускімі рабочымі, вызвалення рабочых і сялян Украіны не магло-б быць. Калі пасля Лютаўскай рэволюцыі на чале ўлады аказалася буржуазія, Мілюкоў, потым Керанскі, што адбывалася ў той перыяд у нацыянальных рэспубліках—у Грузіі, на Украіне, у іншых рэспубліках, калі на чале ўлады аказаліся нацыяналісты? Таксама, як і ўрад Керанскага, але толькі прыкрываючыся фальшывым рэволюцыйным сцягам і нацыянальнымі лозунгамі, гэтыя нацыянальныя ўрады на справе змагаліся за захаванне ўлады буржуазіі. Усе нацыяналістычныя ўрады, у тым ліку і Украінская цэнтральная рада, прыкрываючыся лозунгамі аб «адзінстве нацыі», на справе змагаліся за захаванне і ўмацаванне ўлады буржуазіі, толькі сваёй, мясцовай, нацыянальнай буржуазіі, за стварэнне сваёй уласнай эксплаататарскай дзяржавы. Што мелі-б рабочыя і сяляне, батракі і беднякі Украіны, калі-б гэтыя нацыяналісты ўрады накшталт урада Вінічанкі, Пятлюры, Гетмана і інш. здолелі ўкраінскіх працоўных застаўся на чале ўлады? Рабочыя і сяляне Украіны атрымалі-б толькі другога гаспадара, яны атрымалі-б толькі аднаго эксплаататара вамест другога.

Рабочыя і сяляне Украіны быстра зразумелі, што гэта за «нацыянальнае вызваленне», якое ім абяцаюць, і ў чым сутнасць лозунга аб «адзінстве украінскай нацыі», зразумелі, што гэта нішто іншае, як маска, жульніцкі сцяг для захаплення панавання нацыянальных памешчыкаў і капіталістаў. Рабочыя і сяляне Украіны, гаварыўшыя на адной нацыянальнай мове з Вінічанка і Пятлюрай, але на розных класавых мовах, зразумелі, што без таго, каб скінуць уладу памешчыкаў і буржуазіі, ім не дабіцца свайго вызвалення. Асабліва гэта стала ясна тады, калі рабочы клас Расіі пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў скінуў стаўленікаў буржуазіі—Керанскага, меншэвікоў і эсэраў і ўстанавіў цык татуру пролетарыята. Кастрычніцкая рэволюцыя адкрыла вочы рабочым і сялянам Украіны, з асаблівай сілай агаліла класавую сутнасць нацыяналістычных урадаў. Сяляне марылі прагнаць памешчыкаў, забраць у іх зямлю, а «нацыянальны» ўрад не толькі не прагнаў памешчыкаў, калі далістаў, а ўсямерна ўмацоўваў іх панаванне.

Асабліва праявілі сябе такія Вінічанка, Пятлюра і інш. нацыяналісты, калі сталі перад рэальнай перспэктывай пролетарскай рэволюцыі на Украіне. Яны пайшлі на паклон да немцаў, французаў, палякаў, прадаючы ім Украіну гуртом і ў раздроб, каб разам з душыць рабочых і сялян сваёй нацыянальнасці, тых-жа украінцаў. Яны пайшлі на саюз з Каледзіным і Дзянікіным. Тут лозунг «адзінства нацыі» аніяк, усе яны выключна дружна апанаваліся супроць рабочых і сялян Украіны.

Украінская рабочая і сяляне, раскуёўшы сутнасць нацыяналістычных урадаў і нацыяналістычных партый, разам з расійскімі рабочымі і сялянамі павялі барацьбу супроць эксплаататараў і сваёй, і чужой нацыянальнасці, зрабілі тое, чаму вучыла іх наша партыя, чаму вучыў увесь вопыт барацьбы рабочага класа з прыгнятальнікамі.

У гэтай сумеснай барацьбе стварыўся і ўмацаваўся саюз рускіх рабочых і сялян з украінскімі, умацаваўся ён на аснове класавай салідарнасці, на аснове барацьбы за вырашэнне асноўнай задачы—звяржання ўлады буржуазіі і памешчыкаў.

Яшчэ перад рэволюцыяй, у 1916 годзе, Ленін так фармуляваў задачы рабочага класа і Расіі і прыгнечаных нацыянальнасцей у галіне нацыянальнай палітыкі:

«Пролетарыят (прыгнятаючых нацый) павінен патрабаваць свабоды палітычнага аддзялення калоній і нацый, прыгнятаемых «яго» нацыяй. У адваротным выпадку інтэрнацыяналізм пролетарыята застанецца пустым і славесным; ні давер'е, ні класавая салідарнасць паміж рабочымі прыгнечанай і прыгнятаючай нацыі немагчымы».

І далей:

«З другога боку сацыялісты прыгнечаных нацый павінны ў асабліва'васці адстойваць і праводзіць у жыццё поўнае і безумоўнае, у тым ліку арганізацыйнае адзінства рабочых прыгнечанай нацыі з рабочымі прыгнятаючай нацыі. Без гэтага немагчыма адстаяць самастойную палітыку пролетарыята і яго класавую салідарнасць з пролетарыятам другіх краін пры ўсіх і ўсякіх прадзелках, здрадах і машэнніцтвах буржуазіі, бо буржуазія прыгнечаных нацый заўсёды ператварае лозунгі нацыянальнага вызвалення ў абман рабочых» (ЛЕНІН. «Социялистычная рэволюцыя і права нацый на самавызначэнне». Том XIX, 2-е выд., стар. 41).

Гэта праграма нашай большэвіцкай партыі. Гэту праграму ажыццяўлялі на справе рабочыя і сяляне усіх нацыянальнасцей нашага Саюза ў сумеснай і дружнай барацьбе супроць капіталістаў, незалежна ад нацыянальнасцей.

Ленінскае раз выкрываў усялякі мапшэнікаў—буржуазных і дробна-буржуазных, якія, прыкрываючыся размовамі аб «агульна-нацыянальнай культуры, на справе праводзілі культуру буржуазную. Ленін гаварыў, што няма абстрактнай, адзінанай нацыянальнай культуры наогул, а ёсць культура класавая—або буржуазная, або пролетарская. Хто за адзінаную нацыянальную культуру наогул, той на справе за культуру буржуазную, той супроць пролетарыята.

Як стаяла справа з разуменнем задач нацыянальнай палітыкі на Украіне ў КП(б)У, якая з першых крокаў барацьбы, разгарнуўшайся на Украіне, стала на чале рабочых і сялянскіх мас?

Намала ёсць у нас аматараў расказваць, што КП(б)У тады, у першыя гады рэволюцыі, займала няправільную пазіцыю ў нацыянальным пытанні. Многія з былых членаў дробна-буржуазных нацыяналістычных партый, партый эгоістскіх, потым упайшоўшыя ў рады нашай партыі, вельмі ахвотна гавораць аб тым, што, вядома, мы, маё, украінскія социял-дэмакраты і барацьбісты, пашлі-б у комуністычную партыю і раней, калі-б у комуністаў у той час была правільная нацыянальная палітыка. Таварышы, гэта фальш, гэта паклёп. У ленінскай партыі была выразная і ясная праграма ў нацыянальным пытанні, праграма, цесна звязаная з асноўнай задачай—звяржэннем улады памешчыкаў і буржуазіі. Калі нават сярод асобных членаў партыі і ў асобных партыйных арганізацыях у той перыяд у нацыянальным пытанні і была покатая блытаніна, то лінія партыі ў дадым і ў гэтых адносінах зусім была ясная. Яна з патрэбнай чоткасцю вызначана Леніным. Гэта лінія нашай партыі на першае месца высоўвала адзіны фронт рабочых і сялян усіх нацыянальнасцей для звяржэння памешчыкаў і капіталістаў. Іменна таму за намі, за большэвікамі, на Украіне ішлі найшырэйшыя масы, ішлі і бліжняцка-серадняцкія масы сялянства, якія больш за ўсё адурманьваліся нацыяналістычнымі лозунгамі. Іменна дзякуючы гэтай правільнай, большэвіцкай лініі мы перамаглі, перамагла пролетарская рэволюцыя на Украіне.

Як толькі рабочыя і сялянскія масы раскусілі класавы змест нацыяналістычных лозунгаў, яны пачалі масамі адыходзіць з-пад сцягаў эгоістскіх партый і ішлі да нас, большэвікоў, для таго, каб разам з намі, пад нашым кіраўніцтвам змагацца супроць нацыянальных эгоістскіх правадыроў, супроць украінскай буржуазіі, за Совецкую Украіну. Тут і пачынаецца працэс распада гэтых дробнабуржуазных эгоістскіх партый—украінскіх социял-дэмакратаў, барацьбістаў і інш.

У гэтых партыях былі, безумоўна, і рэвалюцыйныя элементы, ашуканыя эгоістамі прапагандай фальшывымі лозунгамі. У працэсе барацьбы за пролетарскую дыктатуру на Украіне адбылася ліквідацыя рада нацыянальных дробнабуржуазных партый—у тым ліку партыі барацьбістаў, і значная частка членаў гэтых партый перайшла да нас. Але разам з імі ў партыю ўвайшло нямала нацыяналістычных дробнабуржуазных элементаў.

Мы памятаем перыяд ліквідацыі партыі барацьбістаў. Рэвалюцыйная частка гэтай партыі на чэсному шляху шла да нас, разам з намі вяла барацьбу за ўладу Советаў. Значная частка з іх, уваходзячы ў нашу партыю, перавыхавалася ў духу большэвікоў, асімілявалася ў нашых радах, арабілася сапраўдным большэвікам-ленінцам і нага ў нагу з усёй партыяй паслядоўна, да канца змагалася і змагаецца супроць усялякага нацыяналізма — за социялізм. Перад другой часткай барацьбістаў, скрытна - нацыяналістычнай, стала дылема—або перайсці ў лагер адкрытай контр-рэволюцыі, або прыстаць да совецкай улады. І гэтыя нацыяналістычныя элементы, пераканаўшыся, што партыя наша моцная, магутная, што за ёю мільёны рабочых і сялян, што адкрытая барацьба з ёю немагчыма,—застаўшыся на нацыяналістычных сваіх пазіцыях, пашлі ў нашу партыю, марачы завалодаць яе з сярэдзіны. Пазней да іх далучыліся эгаісты, а таксама нямала нацыяналістычных элементаў прынята было ў КП(б)Ун працаўрада год, пасля канчатковай перамогі пролетарскай рэволюцыі. З гэтымі нацыяналістычнымі элементамі нашай партыі ўвесь час прыходзілася весці ўпартую барацьбу. Успомніце барацьбу, якую КП(б)У правяла з групай Лапчынскага, і асабліва з Шумскім і шумскіямам. Барацьба за чыстату нашых радоў, за вызбаўленне ад усяго чужога, небольшэвіцкага, ішла ўвесь час.

Нямала было і ёсць у нас выпадкаў фальсіфікацыі гісторыі рэволюцыйнай барацьбы на Украіне, фальсіфікацыі гісторыі нашай партыі. Гэта выразілася, у прыватнасці, і ў няправільнай ацэнцы эгоістскіх партый і Цэнтральнай рады, у надаванні ім рэволюцыйнай ролі, якой яны не адыгрывалі.

Гэтым спробам нацыяналістычна настроеных элементаў і простых нацыяналістаў сказіць, утаіць сапраўдную сталыпінчна справы мы павінны процістаўляць нашу большэвіцкую ацэнку нацыяналістычных і нацыянал-эгоістскіх партый, у тым ліку Цэнтральнай рады.

Сапраўдным і адзіным посьбітам нацыянальнага вызвалення працоўных на Украіне з'яўляўся і з'яўляецца кіруемы комуністычнай партыяй рабочы клас. Рабочы клас, як найбольш рэволюцыйны, кіраваў усёй барацьбой за перамогу Кастрычніцкай рэволюцыі на Украіне і з'яўляецца ў той-жа час посьбітам сапраўднага нацыянальнага вызвалення украінскіх працоўных мас. Супроць гэтага вызвалення на справе зматаліся украінскія социял-дэмакраты, эсэры, партыі, якія ўваходзілі ў Цэнтральную раду. У гэтым сутнасць пытання. Вось якая сапраўдная гісторыя рэволюцыйнай барацьбы на Украіне.

Мы не дазволім нікому фальсіфікаваць сапраўднай гісторыі вызвалення працоўных мас Украіны. Мы ніколі не дазволім наводзіць паклёпы на нашу партыю. Толькі наша партыя павяла рабочы клас і сялянства Украіны на барацьбу за поўнае нацыянальнае вызваленне працоўных Украіны і яны брацкай памамозе рускага рабочага класа гэтага вызвалення дабіліся.

XII з'езд РКП(б) у сваёй рэзалюцыі па нацыянальнаму пытанню так ацэньвае ролю Кастрычніцкай рэволюцыі ў разняволенні нацыянальнасцей.

«Кастрычніцкая рэволюцыя адным ударам разарвала панцуг на цыянальнага прыгнечання, перавярнула старыя адносіны паміж народамі, падарвала старую нацыянальную варожасць, расчысціла глебу для супрацоўніцтва народаў і заваявала рускаму пролетарыяту давер'е яго іншанацыянальных братоў не толькі ў Расіі, але і ў Эўропе і Азіі. Наўрад ці трэба даказваць, што без такога давер'я рускі пролетарыят не змог-бы перамагчы Калчака і Дзянікіна, Юдзеніча і Врангеля. З другога боку, несумненна, што прыгнечаныя нацыянальнасці не змаглі-б дабіцца свайго вызвалення па-за устанаўлення ў центры Расіі дыктатуры пролетарыята».

Адзінства дзеянняў працоўных розных нацыянальнасцей і выманёўра разгром усёй контр-рэволюцыі, крах інтэрвенцыі, гіганцкі размах социялістычнага будаўніцтва Саюза ў цэлым і ласобных нацыянальных рэспублік, у тым ліку і Украінскай.

Гаворачы аб Украіне ў «Критических заметках по национальному вопросу», Владзімір Ільіч пісаў:

«Пры адзіным дзеянні пролетарыяў вялікарускіх і украінскіх, свабодная Украіна МАГЧЫМА, без такога адзінства аб ёй не можа быць і гутаркі».

Цяпер можна сказаць, выходзячы з вопыта шматгадовай барацьбы, што калі-б не было яднання пролетарыята і сялян—украінцаў і рускіх, не было-б у нас социялістычнай Украіны, а была-б яна пятлюраўскай, дзянікінскай, нямецкай каланіяй, а гэта была-б катарга для працоўных. Толькі дзякуючы падтрымцы рускага пролетарыята, дапамозе з яго боку, рабочы клас і сялянства Украіны пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, стварылі социялістычную, свабодную ад нацыянальнага ўціску Украіну, перад якой адкрываюцца такія вялізарнейшыя перспэктывы, аб якіх пры капіталізме не магла і марыць.

Аберагаць, умацоўваць Совецкі Саюз—вышэйшае дасягненне Кастрычніцкай рэволюцыі

Наша партыя, як авангард рабочага класа, на ўсіх этапах рэволюцыйнай барацьбы высоўвала ў нацыянальным пытанні лозунг інтэрнацыянальнага адзінства працоўных—пролетарскі інтэрнацыяналізм—супроць буржуазнага нацыяналізма. Гэта два ўзаімна процілеглыя, узаемна выключаючыя адзін аднаго лозунгі. Наконт гэтага Ленін пісаў:

«Буржуазны нацыяналізм і пролетарскі інтэрнацыяналізм — вось два непрымірымы варожыя лозунгі, адпавядаючыя двум вялікім класавым лагерам усяго капіталістычнага свету і выражаючыя ДВЗЕ палітыкі (больш таго: два светапогляды) у нацыянальным пытанні».

(Ленін: «Критические заметки по национальному вопросу», 2-е выд., т. XVII, стар. 139).

Тав. Сталін у артыкуле «Аб міжнародным характары Кастрычніцкай рэволюцыі» па гэтаму-ж пытанню сказаў наступнае:

«Звергнуўшы памешчыкаў і капіталістаў, Кастрычніцкая рэволюцыя разбіла панцуг нацыянальна-каланіяльнага ўціску і вызваліла ад яго ўсе без выключэння прыгнечаныя народы абшырнай дзяржавы. Пролетарыят не можа вызваліць сябе, не вызваліўшы прыгнечаных народаў. Характэрнай рысай Кастрычніцкай рэволюцыі з'яўляецца той факт, што яна правяла ў СССР гэтыя нацыянальна-каланіяльныя рэволюцыі не пад сцягам нацыянальнай варожасці і міжнацыянальных сутычак, а пад сцягам узаемнага давер'я і брацкага аблажэння рабочых і сялян нацыянальнасцей СССР, не ў імя НАЦЫЯНАЛІЗМА, а ў імя ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМА, а ў імя ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМА».

Вось, таварышы, у чым найвялікшая заслуга Кастрычніцкай рэволюцыі, у чым асноўная ўмова і прычына яе перамогі, вось што з'яўляецца запрукай далейшых перамог. У справе социялістычнага будаўніцтва.

